Пінскі Веснік 2017. – 4 жніўня. – № 62. – С. 2.

*Летняя занятасць*

# Да працы гатовы!

**Лета — пара не толькі адпачынку і доўгачаканых канікулаў, а і магчымасць для моладзі падзарабіць. Такое жаданне выказалі дзесяць студэнтаў Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, якія аб'ядналіся ў будаўнічы атрад.**



Юнакі гатовы да работы з 7 жніўня. Яны ставяць сваёй мэтай аказваць дапамогу, прынамсі, у перакладцы пліткі, пераафарбоўцы сцен і ва ўсім, што патрабуе абнаўлення перад новым вучэбным годам. Сёлета студатрад пачне дзейнічаць на базе свайго ўніверсітэта. На днях маладыя людзі заключылі дагаворы і гатовы прыступіць да працы.

Арганізацыяй летняй занятасці моладзі займаецца гаркам ГА «БРСМ». Тут адзначаюць, што жадаючых падзарабіць сёлета было дастаткова. Праблемай стала іх працаўладкаванне. Напачатку лета планавалася, што падзарабіць змогуць усе, хто гатовы правесці канікулы на рабочых месцах, а на справе аказалася, што далёка не ўсім прадпрыемствам патрабуюцца новыя работнікі.

Аднак старшыня пярвічкі БРСМ універсітэта Кацярына Масляк упэўнена, што, як толькі на прадпрыемствах з'явяцца новыя вакансіі, студатрадаўцы будуць працаўладкаваны ў поўным саставе.

**Ірына ДЗЕНІСОВІЧ.**
**Фота аўтара.**